Учреждение образования
«Белорусский государственный педагогический университет
имени Максима Танка»

**УТВЕРЖДАЮ**

Декан факультета
доуниверситетской подготовки

_______________ С.В. Яковенко
(подпись)

«3» сентября 2018 г.

# УЧЕБНАЯ ПРОГРАММА

по истории Беларуси

Факультет доуниверситетской подготовки

Всего часов по предмету 160
(количество часов)

Составитель: Т.В. Гришкевич, преподаватель
(Ф.И.О., должность)

Минск, 2018

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# РАБОЧАЯ ПРАГРАМА
# для дзённых падрыхтоўчых курсаў па падрыхтоўцы да цэнтралізаванага тэсціравання па дысцыпліне “Гісторыя Беларусі”

*Праграма складзена выкладчыкам кафедры методыкі выкладання інтэграваных школьных курсаў ФДП – Грышкевіч Т.В.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| № п/п | НАЗВА ТЭМЫ | КОЛЬКАСЦЬ ГАДЗІН | ФОРМЫ КАНТРОЛЮ |
|---|---|---|---|
| 1. | Уводзіны.<br>Прадмет і задачы гістарычнай навукі. Археалагічная (тэхналагічная) перыядызацыя. Перыядызацыя гісторыі Беларусі. | 2 | |
| | **Раздзел 1. Старажытнае грамадства на тэрыторыі Беларусі** – 6 г. | | |
| 2. | Р1.Т1. Старажытнае грамадства ў эпоху каменнага і бронзавага вякоў.<br>Пачатак засялення чалавекам тэрыторыі Беларусі. Першыя стаянкі людзей. Умовы жыцця і прылады працы. Уплыў клімату. Заняткі старажытных жыхароў Беларусі. Асаблівасці вырабу прылад працы ў каменным веку. Пераход ад збіральніцтва да вытворчай гаспадаркі. Зараджэнне і развіццё жывёлагадоўлі і земляробства. Старажытнае грамадства ў эпоху каменнага і бронзавага вякоў. Эвалюцыя шлюбна-сямейных адносін і грамадскага ладу. Узнікненне маёмаснай няроўнасці сярод людзей. Уяўленне першабытных людзей аб навакольным асяроддзі. Старажытнае мастацтва. | 3 | Праца з тэставымі заданнямі |
| 3. | Р1.Т2. Насельніцтва Беларусі ў жалезным веку (VIII-VII ст. да н.э. – IV-V ст.н.э.).<br>Асноўнае насельніцтва тэрыторыі Беларусі. Праблемы яго паходжання і этнічнай ідэнтыфікацыі. Распад індаеўрапейцаў. Узнікненне балтаў, славян, германцаў і іншых народаў. Тэрыторыі іх рассялення. Сацыяльна-эканамічнае развіццё плямёнаў эпохі жалеза. Змены ў гаспадарцы, матэрыяльнай і духоўнай культуры. | 3 | Праца з тэставымі заданнямі |
| | **Раздзел 2. Узнікненне на тэрыторыі Беларусі класавага шматукладнага грамадства і дзяржаўнасці (V-VI – 1-я пал. XIII стст.)** – 15 г. | | |
| 4. | Р2.Т1. Засяленне славянамі тэрыторыі Беларусі.<br>Насельніцтва Беларусі ў сярэдзіне I тыс. н.э. Пачатак засялення славянамі тэрыторыі Беларусі. Балты і славяне ў міжрэччы Прыпяці, Дняпра, Заходняй Дзвіны, у Пабужжы і Верхнім Панямонні. Супольнасці крывічоў-палачан, дрыгавічоў, радзімічаў. Грамадскі лад усходніх славян. Утварэнне сельская (суседскай абшчыны). | 2 | Праца з тэставымі заданнямі К/р № 1 |
| 5. | Р2.Т2. Язычніцкія вераванні і абрады.<br>Паходжанне рэлігіі. Язычніцкія вераванні ва ўсходніх славян. Пантэон усходнеславянскіх багоў. Звычаі і абрады насельніцтва Беларусі. Народны каляндар. | 1 | Праца з тэставымі заданнямі |
| 6. | Р2.Т2. Сацыяльна-эканамічнае развіццё ў IX – сярэдзіне XIII стст. Складванне феадальных адносін.<br>Узнікненне феадалізму ў Заходняй і Цэнтральна-Усходняй Еўропе. Гаспадарчыя заняткі ўсходніх славян. Стан сельскай гаспадаркі. Узнікненне і рост гарадоў. Гарадскія рамёствы, унутраны і знешні гандаль. Роля гарадоў у грамадскім жыцці. Шматукладнасць гаспадаркі. Узмацненне феадальнага ўкладу. Распад сельскай (суседскай) абшчыны. Сацыяльны падзел насельніцтва. Формы залежнасці і эксплуатацыі сялян. Фарміраванне ваенна-служылай знаці. Даніна і палюддзе. | 4 | Праца з тэставымі заданнямі |
| 7. | Р2.Т3. Узнікненне дзяржаўнасці ва ўсходніх славян (Кіеўская Русь). Першыя дзяржаўныя ўтварэнні на тэрыторыі Беларусі (Полацкае і Тураўскае княствы).<br>Погляды гісторыкаў на праблему паходжання дзяржавы ва ўсходніх славян і назвы “Русь”. Складванне агульнай дзяржавы Кіеўскай | 5 | Праца з тэставымі заданнямі |

| | | | |
|---|---|---|---|
| | Русі. Пашырэнне ўлады кіеўскіх князёў на княжанні ўсходніх славян і землі балтаў і фіна-ўграў. Дынастыя кіеўскіх князёў і стварэнне ўдзелаў. Грамадска-палітычны лад, роля веча ў палітычным жыцці Полацкай і Тураўскай зямель. Узаемаадносіны з Кіевам і Ноўгарадам. Полацкая княжацкая дынастыя. Брачыслаў і Усяслаў Брачыслававіч, іх унутраная і знешняя палітыка. Берасцейская зямля і Пасожжа | | |
| 8. | Р2.Т4. З'яўленне і распаўсюджанне хрысціянства.<br>Сутнасць хрысціянства. З'яўленне дзвюх хрысціянскіх цэркваў. Прычыны прыняцця хрысціянства як афіцыйнай рэлігіі. Стварэнне епархій і ўзнікненне манастыроў. Цяжкасці распаўсюджання новай веры. Значэнне прыняцця хрысціянства для ўсходніх славян. Спалучэнне хрысціянскіх і язычніцкіх вераванняў у народнай свядомасці, у традыцыях і абрадах. Уплыў хрысціянства на палітычнае жыццё, культуру і мараль. | 1 | Праца з тэставымі заданнямі |
| 9. | Р2.Т5. Фальклор і пісьменства. Архітэктура і жывапіс IX–XIII стст.<br>Вусная народная творчасць. Паданні пра Рагнеду і Усяслава Чарадзея. З'яўленне пісьменства і першыя яго помнікі. Летапісанне ўсходніх славян. Звесткі пра Кіеўскую Русь і землі Беларусі ў летапісах і паданнях іншых краін і народаў. Рукапісныя кнігі. Літаратура. Рэлігійна-асветніцкія дзеячы, іх жыццё і дзейнасць (Ефрасіння Полацкая, К. Тураўскі. З'яўленне пісьмовых помнікаў з характэрнымі прыкметамі беларускай мовы. Архітэктура і жывапіс Кіеўскай Русі. Царкоўнае і абарончае дойлідства на Беларусі. Фрэскавы жывапіс. Прыкладное мастацтва. | 2 | Праца з тэставымі заданнямі. К/р № 2. |
| **Раздзел 3. Беларускія землі ў сярэдзіне XIII – 1-й палове XVI ст.** – 27 г. | | | |
| 10 | Р3.Т1. Феадальная раздробленасць на землях Беларусі. Знешнепалітычная сітуацыя ў кан. XII – 1-й пал. XIII ст.<br>Прычыны феадальнай раздробленасці, узаемаадносіны паміж удзельнымі княствамі. Агрэсія нямецкіх феадалаў-крыжакоў ва Усходняй Прыбалтыцы. Нашэсце мангола-татар на Русь і Цэнтраль Еўропу. Неабходнасць ваенна-палітыч саюзу беларускіх і літоўскіх зямель. | 2 | Праца з тэставымі заданнямі |
| 11 | Р3.Т2. Утварэнне Вялікага княства Літоўскага, Рускага, Жамойцкага.<br>Палітычная сітуацыя на беларускіх землях ў кан XII – пач XIII ст. Сацыяльна-эканамічны і грамадскі лад Літвы, набегі Літвы. Узвышэнне Міндоўга ў Навагрудку. Узаемаадносіны з Галіцка-Валынскім княствам, Польскай дзяржавай і крыжакамі. Міжусобная барацьба пасля смерці Міндоўга. ВКЛ як цэнтр збірання ўсходнеславянскіх зямель. Усходнеславянскі характар гэтай дзяржавы і федэратыўны прынцып яе пабудовы. Шляхі ўключэння беларускіх зямель у склад ВКЛ. | 5 | Праца з тэставымі заданнямі |
| 12 | Р3.Т3. Унутрыпалітычнае становішча і знешняя палітыка Вялікага княства Літоўскага ў канцы XIII – 70-я гг. XIV ст.<br>Палітычная сітуацыя, дзяржаваўтваральныя працэсы ў 2-ой пал XIII – 1-й пал XIV ст. ва Усх. Еўропе. Цэнтралізатарскія тэндэнцыі ў палітыцы вялікіх князёў літоўскіх. Умацаванне адзінаўладдзя пры Віцене і Гедыміне, пашырэнне тэрыторыі дзяржавы пры Альгердзе. Адносіны з Ордэнам, Залатой Ардой, Маскоўскім княствам. | 2 | Праца з тэставымі заданнямі |
| 13 | Р3.Т4. Вялікае княства Літоўскае ў канцы XIV – XV ст.<br>Дынастычная барацьба ў 70–90-я гг. XIV ст. Крэўская унія і яе вынікі. Знешняя і ўнутраная палітыка Вітаўта. Грунвальдская бітва і яе значэнне. Унутрыпалітычныя супярэчнасці паміж Свідрыгайлам і Жыгімонтам, грамадзянская вайна 30-х гг. XV ст. і яе значэнне. Казімір IV і яго палітыка. | 3 | Праца з тэставымі заданнямі |
| 14 | Р3.Т5. Палітычнае становішча ВКЛ у першай палове XVI ст. Праўленне Аляксандра і Жыгімонта I Старога. Пашырэнне правоў паноў-рады. Страта ВКЛ першынства ў збіранні "рускіх" зямель. Адносіны з Вялікім Княствам Маскоўскім. Абарона ад набегаў крымскіх татар. Выступленне М. Глінскага. Супярэчнасці паміж магнатамі і шляхтай. | 2 | Праца з тэставымі заданнямі |
| 15 | Р3.Т6. Дзяржаўны лад, органы ўлады і кіравання. Мясцовае кіраванне. Судовая сістэма.<br>Унутраны лад дзяржавы. Сталіца, герб, мова дзяржаўнага справаводства. Вышэйшыя органы ўлады. Прэрагатывы вялікага князя. Паны-рада. Сойм. Арганізацыя вайсковай справы. Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел дзяржавы. Сістэма мясцовых органаў улады і кіравання. Судзебнік 1468 г. Сатуты ВКЛ 1529, 1566 і 1588 гг. | 3 | Праца з тэставымі заданнямі |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| | | | |
|---|---|---|---|
| 16 | Р3.Т7. Эканамічнае развіццё і сацыяльныя адносіны ў XIV — першай палове XVI ст. Унутраны гандаль і знешнеэканамічныя сувязі.<br>Сельская гаспадарка і асаблівасці яе развіцця. Землеўладанне і землекарыстанне. Павіннасці сялян. Запрыгоньванне сялян. Гарады і мястэчкі. Магдэбурскае права і яго роля ў грамадска-палітычным жыцці гарадоў. Рамествы і промыслы. Беларускія землі ў гандлёва-эканамічных стасунках еўрапейскіх краін. Саслоўная структура грамадства ў ВКЛ. Сацыяльныя канфлікты. | 5 | Праца з тэставымі заданнямі |
| 17 | Р2.Т8. Культура Беларусі ў XIV — першай палове XVI ст. Абарончае дойлідства. Культавыя пабудовы. Жывапіс і скульптура. Выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва. Пачатак беларуска-літоўскага летапісання. Рэнесансавая культура ў Беларусі. З'яўленне новалацінскай паэзіі. М. Гусоўскі. Францыск Скарына — усходнеславянскі і беларускі гуманіст і асветнік. Погляды Ф. Скарыны і яго друкарская дзейнасць. | 2 | Праца з тэставымі заданнямі. |
| 18 | Р3.Т6.Этнічныя працэсы на беларускіх землях.<br>Прычыны і перадумовы складвання беларускай народнасці. Фарміраванне этнічнай тэрыторыі, развіццё мовы і этнічнай самасвядомасці. Этнічныя меншасці і іх роля ў этнічных працэсах на беларускіх землях. Паходжанне назвы "Белая Русь". Менталітэт беларускага народа. Народная матэрыяльная і духоўная культура. | 3 | Праца з тэставымі заданнямі. К/р № 3. |
| **Раздзел 4. Беларусь у другой палове XVI - XVIII ст.** – 22 г. | | | |
| 19 | Р4.Т1. Утварэнне Рэчы Паспалітай. Становішча ВКЛ у палітычнай сістэме Рэчы Паспалітай.<br>Лівонская вайна і яе вынікі. Перадумовы ўтварэння Рэчы Паспалітай. Люблінскі сойм і яго рашэнні. Умовы аб'яднання Кароны Польскай і Вялікага княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага. Барацьба шляхты за больш самастойнае кіраванне. Інтэграцыйныя і дэзінтэграцыйныя працэсы ў палітыка-дзяржаўным развіцці Рэчы Паспалітай. Паслабленне цэнтральных улад. Статут 1588 г. і яго значэнне. Паланізацыя беларускай шляхты. | 5 | Праца з тэставымі заданнямі |
| 20 | Р4.Т2. Сельская гаспадарка і гарадское жыццё ў Вялікім Княстве Літоўскім у другой палове XVI — XVII ст.<br>Уплыў гаспадарчых працэсаў у краінах Заходняй Еўропы на эканоміку ВКЛ. Аграрная рэформа 1557 г. Станаўленне фальваркова-паншчыннай сістэмы гаспадарання. Феадальнае землеўладанне. Феадальныя павіннасці сялян. Сацыяльныя супярэчнасці ў вёсцы. Стан гарадоў і іх гандлёвыя сувязі. Юрыдыкі. Мястэчкі. Цэхі. Унутраны і знешні гандаль. Гандлёва-эканамічныя сувязі беларускіх зямель з еўрапейскімі краінамі. Узмацненне антыфеадальнай барацьбы. Гарадскія паўстанні. | 2 | Праца з тэставымі заданнямі |
| 21 | Р4.Т3. Царква і рэлігія на беларускіх землях у XVI — першай палове XVII ст.<br>Канфесійнае становішча ў ВКЛ. Рэлігійная верацярпімасць. Традыцыйнае хрысціянства: праваслаўе і каталіцызм. Крызіс праваслаўнай царквы. Перадумовы рэфармацыйнага руху. Асаблівасці Рэфармацыі на беларускіх землях. Дзеячы Рэфармацыі: Мікалай Радзівіл Чорны, Сымон Будны, Васіль Цяпінскі. Контррэфармацыя. П. Скарга. Дзейнасць Ордэна езуітаў на тэрыторыі Беларусі. Берасцейскі царкоўны сабор 1596 г. Уніяцкая царква. | 3 | Праца з тэставымі заданнямі |
| 22 | Р4.Т4. Знешняя палітыка Рэчы Паспалітай у канцы XVI – 1-ай палове XVII ст.<br>Завяршэнне Лівонскай вайны. Заключэнне і ўмовы Ям-Запольскага міру (1582 г.). Інтэрвенцыя Рэчы Паспалітай у Маскоўскую дзяржаву. Дэўлінскае перамір'е (1618 г.). Барацьба са Швецыяй за Прыбалтыку. Барацьба за Смаленск у 30-я гг. XVII ст. | 2 | Праца з тэставымі заданнямі |
| 23 | Р4.Т5. Унутрыпалітычнае і знешнепалітычнае становішча беларускіх зямель ў 2-ой палове XVII – 1-ай палове XVIII ст.<br>Казацка-сялянская вайна 1648–1651 гг. ў Беларусі. Баявыя дзеянні казацка-сялянскіх атрадаў супраць шляхецкага апалчэння і войск наёмнікаў. Абарона Пінска, Мазыра, Бабруйска. Бітва пад Лоевам. Вынікі антыфеадальнай барацьбы для Беларусі. Вайна Расіі з Рэччу Паспалітай у 1654–1667 гг. Прычыны і перадумовы вайны, ход ваенных дзеянняў на тэрыторыі Беларусі. Адносіны насельніцтва да варагуючых бакоў. Палітыка царызму. Народны рух у 2-ой пал. 50-х – пач. 60-х гг. XVII ст. Вызваленне тэрыторыі Беларусі. Вынікі вайны для Беларусі. Вайна са Швецыяй 1655-1660 гг. Паўночная вайна. Ваенныя дзеянні на Беларусі. Бітва каля в. Лясная. Вынікі вайны для Беларусі. | 3 | Праца з тэставымі заданнямі |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| | | | |
|---|---|---|---|
| 24 | Р4.Т6. Сацыяльна-эканамічнае становішча Беларусі ў 2-ой палове XVII – XVIII ст.<br>Эканамічны заняпад краіны ў 2-ой палове XVII – сярэдзіне XVIII ст., яго прычыны. Стан сельскай гаспадаркі. Гарады і гандаль. Самакіраванне. Нармалізацыя эканамічнага жыцця ў 2-ой палове – сярэдзіне XVIII ст. Аднаўленне сялянскай гаспадаркі. Рост прыгонніцкай эксплуатацыі сялян. Павіннасці і пабооры. Сацыяльная безабароннасць. Народныя хваляванні. Крычаўскае паўстанне. Паўстанне на Каменшчыне. Рамесная і мануфактурная вытворчасць. | 2 | Праца з тэставымі заданнямі |
| 25 | Р4.Т6. Падзелы Рэчы Паспалітай. Уключэнне Беларусі ў склад Расійскай імперыі<br>Палітычны крызіс Рэчы Паспалітай. Барацьба магнацкіх груповак за ўладу. Паслабленне цэнтральнай улады і шляхецкая анархія. Выкарыстоўванне еўрапейскімі краінамі паслаблення Рэчы Паспалітай, абарона “залатых шляхецкіх вольнасцей”. Спробы рэформ. Канстытуцыя 3 мая 1791 г. Падзелы Рэчы Паспалітай. Паўстанне пад кіраўніцтвам Т. Касцюшкі: прычыны, характар, вынікі. Я. Ясінскі, М. Клеафас Агінскі. | 3 | Праца з тэставымі заданнямі |
| 26 | Р4.Т7. Адукацыя і навука Беларусі ў другой палове XVI — XVIII ст.<br>Сістэма адукацыі: каталіцкія, пратэстанцкія, праваслаўныя школы. Віленская акадэмія. Пашырэнне ідэй Асветніцтва на тэрыторыі Беларусі. Асаблівасці Асветніцтва ў Беларусі. Адукацыйная камісія. Сістэма адукацыі на беларускіх землях у XVIII ст. Стварэнне прафесійных навучальных устаноў. Навука: К. Семяновіч, І. Капіевіч, М. Пачобут-Адляніцкі, А. Нарушэвіч і інш. | 1 | Праца з тэставымі заданнямі |
| 27 | Р4.Т8. Культура Беларусі ў другой палове XVI — XVIII ст. Уплыў Асветніцтва.<br>Рэнесанс у другой палове XVI — першай палове XVII ст. Кнігадрукаванне. Грамадска-палітычная думка. Літаратура. Сімяон Полацкі. Рэнесансавы характар палацава-замкавага будаўніцтва. Стыль барока ў архітэктуры. Віленскае барока. Жывапіс. «Сармацкі партрэт». Віленская мастацкая школа. Музычнае мастацтва. «Полацкі сшытак». Батлейка. Тэатральнае мастацтва. Асветніцтва. Дзейнасць беларускіх майстроў-рамеснікаў. Асаблівасці развіцця народнай культуры. | 1 | Праца з тэставымі заданнямі |
| | **Раздзел 5. Беларусь у складзе Расійскай імперыі – 25 г.** | | |
| 28 | Р5.Т1. Уключэнне Беларусі ў склад Расійскай імперыі. Грамадска-палітычнае становішча Беларусі ў 1-ай палове XIX ст.<br>Дзяржаўная палітыка на далучаных землях. Змены ў палітычным становішчы насельніцтва беларускіх зямель. Новы тэрытарыяльна-адміністрацыйны падзел. Змены ў органах улады. Сацыяльная і канфесійная палітыка царскіх улад. Ліквідацыя ўніяцкай царквы. Польскія і расійскія дваранскія рэвалюцыянеры ў Беларусі. Уплыў паўстання 1830—1831 гг. на грамадска-палітычны рух у Беларусі. Змяненні ў палітыцы самадзяржаўя пасля паўстання. | 3 | Праца з тэставымі заданнямі К/р № 4. |
| 29 | Р5.Т2. Беларусь у вайне 1812 г.<br>Міжнароднае становішча напярэдадні 1812 г. Баявыя дзеянні на тэрыторыі Беларусі. Палітыка французскіх акупацыйных улад. Спроба аднаўлення ВКЛ. Партызанскі рух і яго характар. Вынікі вайны для Беларусі. | 1 | Праца з тэставымі заданнямі |
| 30 | Р5.Т3. Сацыяльна-эканамічнае развіццё ў канцы XVIII – 50-х гг. XIX ст.<br>Землеўладанне і памешчыцкая гаспадарка. Становішча сялян і іх павіннасці. Крызіс феадальна-прыгонніцкай сістэмы гаспадарання. Рэформа П. Дз. Кісялёва ў дзяржаўнай вёсцы. Інвентарная рэформа. Развіццё прамысловасці. Развіццё шляхоў зносін і гандлю. Роля кірмашоў | 4 | Праца з тэставымі заданнямі |
| 31 | Р5.Т4. Культура Беларусі ў канцы XVIII – 1-ай палове XIX ст.<br>Змены ў сістэме адукацыі. Тыпы школ. Вышэйшыя навучальныя ўстановы. Станаўленне навуковых ведаў пра Беларусь і беларускі народ. Літаратура. Станаўленне беларускай літаратурнай мовы. Тэатр. Музыка. Жывапіс. Архітэктура. Дзеячы культуры: Я. Чачот, К. і Я. Тышкевічы, Я. Баршчэўскі, У. Сыракомля, В. Дунін-Марцінкевіч, П. Багрым, І. Хруцкі, В. Ванькові, С. Манюшка | 2 | Праца з тэставымі заданнямі |
| 32 | Р5.Т5. Скасаванне прыгона, іншыя буржуазныя рэформы. Паўстанне 1863–1864 гг.<br>Падрыхтоўка рэформы 1861 г. у Беларусі. Маніфест і “Палажэнні” 19 лютага 1861 г., іх мясцовыя асаблівасці. Выкупная аперацыя. Вынікі і значэнне адмены прыгоннага права. Прычыны і характар паўстання пад кіраўніцтвам К.Каліноўскага. ”Белыя” і “чырвоныя”. | 3 | Праца з тэставымі заданнямі |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| | | | |
|---|---|---|---|
| | Арганізацыя паўстанцкіх атрадаў і іх дзеянні на тэрыторыі Беларусі. Меры царскай адміністрацыі ў сувязі з паўстаннем. М.М.Мураўёў. Падаўленне паўстання. Вынікі і значэнне паўстання 1863–1864 гг. Асаблівасці правядзення буржуазна-дэмакратычных рэформ і контррэформ у Беларусі і іх вынікі. | | |
| 33 | Р5.Т6. Грамадска-палітычны рух у 60–90-я гг. XIX ст.<br>Асноўныя плыні грамадска-палітычнага руху. Становішча сялян. Характар, дынаміка і формы іх руху. Народніцкія гурткі на Беларусі. Становішча, хваляванні і стачкі рабочых. Сацыял-дэмакратычныя арганізацыі ў Беларусі. Грамадская думка і яе плыні. Ідэйна-арганізацыйнае самавызначэнне беларускага нацыянальнага руху. Беларускія студэнцкія арганізацыі. | 2 | Праца з тэставымі заданнямі |
| 34 | Р5.Т7. Сельская гаспадарка ў 60–90-я гг. XIX ст. Развіццё капіталізму ў прамысловасці.<br>Асноўныя сацыяльныя працэсы ў вёсцы. Сутнасць адпрацовачнай сістэмы. Памешчыцкае і сялянскае землеўладанне. Сацыяльнае расслаенне сялянства. Фарміраванне аграрнай буржуазіі. Спецыялізацыя сельскай гаспадаркі. Асноўныя галіны прамысловасці у другой палове XIX ст. Пераход ад ручной да машыннай вытворчасці ў прамысловасці. Дробная вытворчасць. Тэрытарыяльнае размяшчэнне прамысловых прадпрыемстваў. Будаўніцтва чыгунак. Рост гарадоў. Фарміраванне пралетарыяту. Асаблівасці урбанізацыі ў Беларусі. Фарміраванне буржуазіі. Асноўныя напрамкі гандлёвых сувязей. | 3 | Праца з тэставымі заданнямі |
| 35 | Р5.Т8. Беларусь на рубяжы XIX–XX стст. Рэвалюцыйныя падзеі 1905–1907 гг. у Беларусі.<br>Абвастрэнне сацыяльных супярэчнасцей і нацыянальнага пытання. Яўрэйскі рух у Беларусі. Сацыял-дэмакратычныя арганізацыі. Мясцовыя арганізацыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў і “Польскай партыі сацыялістычнай на Літве”. Утварэнне Беларускай сацыялістычнай грамады. Уздым рабочага руху. Пачатак першай расійскай рэвалюцыі. Выступленні рабочых Беларусі ў студзені–верасні 1905 г. Сялянскі рух і выступленні салдат. Кастрычніцкая палітычная стачка на Беларусі. Маніфест 17 кастрычніка. Дзейнасць I і II Дзяржаўных дум. Беларускі нацыянальны рух у перыяд рэвалюцыі. | 2 | Праца з тэставымі заданнямі |
| 36 | Р5.Т9. Эканамічнае і палітычнае становішча Беларусі ў 1906–1913 гг.<br>Прамысловы крызіс і дэпрэсія 1900–1908 гг. Прамысловы ўздым у наступныя гады. Канцэнтрацыя вытворчасці. Спецыялізацыя прамысловасці. Становішча ў сельскай гаспадарцы. Сталыпінская аграрная рэформа. Яе вынікі і значэнне. Земская рэформа, яе асаблівасці і значэнне. Наступленне палітычнай рэакцыі, выбарчы закон ад 3 чэрвеня 1907 г. Дэмакратычны лагер. Аслабленне рэвалюцыйных партый. Спецыфіка ліберальнага руху ў Беларусі. Нацыянальныя партыі на Беларусі. Рабочы і сялянскі рух. | 1 | Праца з тэставымі заданнямі |
| 37 | Р5.Т10. Беларусь у гады першай сусветнай вайны і Лютаўскай рэвалюцыі.<br>Пачатак вайны. Баявыя дзеянні на тэрыторыі Беларусі. Бежанства. Ваенныя павіннасці. Гаспадарка. Харчовы крызіс. Рост антыўрадавых і антываенных настрояў. Рабочы і сялянскі рух. Разлажэнне ў войску._Палітычнае становішча ў Беларусі пасля звяржэння царызму. Двоеўладдзе і яго сутнасць. Палітычныя сілы на Беларусі. Канец двоеўладдзя. Беларускі нацыянальны рух. | 2 | Праца з тэставымі заданнямі |
| 38 | Р5.Т11. Культура Беларусі ў 2-ой палове XIX - пачатку XX ст.<br>Фарміраванне беларускай нацыі. Асаблівасці саслоўнага і канфесійнага складу насельніцтва Беларусі. Нацыянальная самасвядомасць. Роля газеты “Наша ніва” ў развіцці культуры Беларусі. Змены ў сістэме адукацыі. Навуковыя даследаванні аб мове, этнаграфіі беларусаў, гісторыі Беларусі. І. Насовіч. Я. Карскі, М. Доўнар-Запольскі, В. Ластоўскі. Заходнерусізм. М. Каяловіч. Развіццё беларускай літаратурнай мовы і літаратуры. Кірункі творчасці Ф. Багушэвіча, Я. Лучыны, Цёткі, Я. Купалы, Я. Коласа, М. Багдановіча. Станаўленне беларускага прафесійнага тэатра. І. Буйніцкі. Жывапіс: К. Альхімовіч, Н. Орда, Н. Сілівановіч, В. Бялыніцкі-Біруля. Развіццё архітэктуры. | 2 | Праца з тэставымі заданнямі К/р № 5. |
| | **Раздзел 6. Беларусь у 1917–1939 гг.** – 18 г. | | |
| 39 | Р6.Т1. Кастрычніцкая рэвалюцыя і ўстанаўленне савецкай улады ў Беларусі.<br>Нарастанне супярэчнасцей у грамадстве. Рашэнні II Усерасійскага з’езда Саветаў і іх роля ва ўсталяванні новай рэвалюцыйнай улады. | 3 | Праца з тэставымі заданнямі |

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

| | | | |
|---|---|---|---|
| | Пераход улады ў рукі Саветаў на Заходнім фронце і ў Беларусі. Утварэнне Абласнога выканаўчага камітэта Заходняй вобласці і фронту. Першыя пераўтварэнні. | | |
| 40 | Р6.Т2. Абвяшчэнне і ўтварэнне беларускай дзяржаўнасці ў 1917 – 1920 гг. Пазіцыя бальшавікоў па нацыянальным пытанні. Скліканне Усебеларускага з'езда, яго рашэнні і роспуск. Абвяшчэнне Беларускай Народнай Рэспублікі. Дзейнасць Рады БНР. Абвяшчэнне Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Беларусі. Першы Усебеларускі з'езд Саветаў і яго рашэнні. Абвяшчэнне ЛітБел. Другое абвяшчэнне ССРБ. | 3 | Праца з тэставымі заданнямі |
| 41 | Р6.Т3. Беларусь у гады замежнай інтэрвенцыі Наступленне войск кайзераўскай Германіі. Брэсцкі мір і яго вынікі для Беларусі. Устанаўленне германскага акупацыйнага рэжыму. Барацьба супраць германскіх акупантаў. Польска-савецкая вайна. Устанаўленне польскага акупацыйнага рэжыму і арганізацыя барацьбы з ім. Вызваленне войскамі Чырвонай Арміі тэрыторыі Беларусі ад польскіх інтэрвентаў. Рыжскі мірны дагавор і яго вынікі для Беларусі. | 2 | Праца з тэставымі заданнямі |
| 42 | Р6.Т4. БССР у гады новай эканамічнай палітыкі. Сацыяльна-эканамічнае становішча Беларусі пасля Першай сусветнай і грамадзянскай войнаў. Палітыка "ваеннага камунізму". Увядзенне новай эканамічнай палітыкі. Уплыў нэпа на пад'ём сельскай гаспадаркі, развіццё прамысловасці, гандлю. Устанаўленне аднапартыйнай сістэмы. Удзел БССР ва ўтварэнні Саюза ССР. Узбуйненні тэрыторыі БССР. Канстытуцыя БССР 1927 г. | 2 | Праца з тэставымі заданнямі |
| 43 | Р6.Т5. БССР у канцы 1920-х – 1930-я гг. Пераход да планавай дзяржаўнай эканомікі. Асаблівасці правядзення індустрыялізацыі ў БССР і яе вынікі. Погляды на шляхі пераўтварэнняў у сельскай гаспадарцы, формы кааперавання сялянскіх гаспадарак. Калектывізацыя сельскай гаспадаркі ў БССР: тэмпы, метады і вынікі калгаснага будаўніцтва. Грамадска-палітычнае жыццё. Канстытуцыя БССР 1937 г. Роля Камуністычнай партыі і Саветаў. Палітычныя рэпрэсіі. | 3 | Праца з тэставымі заданнямі |
| 44 | Р6.Т6. Палітыка беларусізацыі. Развіццё адукацыі, навукі і культуры ў БССР у 1920 – 1930-я гг. Асноўныя напрамкі і мерапрыемствы беларусізацыі, яе вынікі і значэнне. Меры па ліквідацыі непісьменнасці. Станаўленне і развіццё сістэмы адукацыі ў БССР. Інстытут беларускай культуры. Утварэнне Беларускай Акадэміі навук. | 2 | Праца з тэставымі заданнямі |
| 45 | Р6.Т7. Асноўныя напрамкі і тэмы ў творчасці беларускіх пісьменнікаў. Я. Купала, Я. Колас, М. Гарэцкі, П. Броўка, М. Лынькоў. Станаўленне беларускага савецкага тэатра: Я. Міровіч, У. Галубок. Тэатральнае і музычнае мастацтва: К. Крапіва, Г. Глебаў, А. Багатыроў. Станаўленне беларускага кіно. Ю. Тарыч, У. Корш-Саблін. Вядучыя тэмы выяўленчага мастацтва: І. Ахрэмчык, І. Давыдовіч. Архітэктура і скульптура. І. Лангбард, Г. Лаўроў, З. Азгур. | 1 | Праца з тэставымі заданнямі |
| 46 | Р6.Т8. Становішча Заходняй Беларусі ў складзе Польшчы (1921–1939 гг.) Палітычныя і сацыяльна-эканамічныя ўмовы жыцця заходнебеларускага насельніцтва. Насаджэнне асадніцтва. Нацыянальна-культурны ўціск. Нацыянальна-вызваленчы рух. Дзейнасць Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі. Беларуская сялянска-работніцкая грамада. Дзейнасць Таварыства беларускай школы. Стан культуры ў Заходняй Беларусі. Адукацыя. Літаратура: П. Пестрак, М. Танк. Жывапіс: Я. Драздовіч, П. Сергіевіч. Музычнае мастацтва. Р. Шырма. | 2 | Праца з тэставымі заданнямі К/р № 6. |
| **Раздзел 7. Беларусь у гады другой сусветнай вайны (1939–1945 гг.) – 10 г.** | | | |
| 47 | Р7.Т1. Уз'яднанне Заходняй Беларусі з БССР. Пачатак Другой сусветнай вайны. Пачатак другой сусветнай вайны. Прычыны і характар вайны. Нападзенне Германіі на Польшчу. Уваходжанне Заходняй Беларусі ў склад СССР і БССР. Стварэнне і дзейнасць органаў Савецкай улады. Сацыяльна-эканамічныя пераўтварэнні. | 1 | Праца з тэставымі заданнямі |
| 48 | Р7.Т2. Пачатак Вялікай Айчыннай вайны. Нападзенне Германіі на СССР. Абарончыя баі ў Беларусі і іх вынікі. Гераізм і патрыятызм савецкіх людзей. Прычыны адступлення | 2 | Праца з тэставымі |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| | | | |
|---|---|---|---|
| | войск Чырвонай Арміі на першым этапе вайны. Устанаўленне нямецка-фашысцкага акупацыйнага рэжыму на тэрыторыі Беларусі. Акупацыйная палітыка. Палітыка генацыду. | | заданнямі |
| 49 | Р7.Т3. Акупацыйны рэжым фашысцкіх захопнікаў на тэрыторыі Беларусі. Разгортванне партызанскага руху і падпольнай барацьбы на акупіраванай тэрыторыі.<br>Мэты акупацыйнай палітыкі. Падзел тэрыторыі. Сістэма акупацыйных органаў. Беларускія калабарацыйныя арганізацыі. Акупацыйны рэжым у Беларусі. Антыфашысцкі рух. Дзейнасць КПБ(б) ва ўмовах акупацыі. Камсамольскае і партыйнае падполле. Партызанскія атрады. Партызанскія зоны. “Рэйкавая вайна”. Асаблівасці партызанскага руху ў Заходняй Беларусі. | 2 | Праца з тэставымі заданнямі |
| 50 | Р7.Т3. Барацьба беларускага народа супраць нямецка-фашысцкіх акупантаў.<br>Роля КП(б)Б у арганізацыі барацьбы з нямецка-фашысцкімі акупантамі. Стварэнне партызанскіх атрадаў. Баявая дзейнасць партызанскіх фарміраванняў. Асаблівасці разгортвання партызанскага руху ў заходніх раёнах Беларусі. Партызанскія зоны. “Рэйкавая вайна”. Партыйнае і маладзёжна-камсамольскае падполле. Масавае супраціўленне мірнага насельніцтва акупацыйнаму рэжыму. Калабарацыянізм. | 2 | Праца з тэставымі заданнямі |
| 51 | Р7.Т5. Вызваленне Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Заканчэнне Вялікай Айчыннай і Другой сусветнай войнаў<br>Пачатак вызвалення БССР. Беларуская наступальная аперацыя “Баграціён”. Дапамога партызан і насельніцтва Чырвонай Арміі. Вызваленне Мінска. Подзвігі савецкіх воінаў. Значэнне разгрому гітлераўцаў у Беларусі. Воіны-беларусы на франтах Вялікай Айчыннай вайны. Уклад беларускага народа ў перамогу над фашысцкай Германіяй. Вытокі патрыятызму беларускага народа ў Вялікай Айчыннай вайне. | 3 | Праца з тэставымі заданнямі К/р № 7. |
| | **Раздзел 8. БССР у сярэдзіне 50-х – 80-я гг. ХХ ст.** – 15 г. | | |
| 52 | Р8.Т1. Беларусь у першае пасляваеннае дзесяцігоддзе. Удзел БССР у заснаванні ААН.<br>Страты, якія прычыніла вайна і фашысцкая акупацыя Беларусі. Пасляваеннае аднаўленне народнай гаспадаркі. Працоўны подзвіг беларускага народа. Паскарэнне тэмпаў індустрыялізацыі БССР. Апераджальны рост цяжкай прамысловасці. Становішча ў сельскай гаспадарцы і меры па яе аднаўленні. Ажыццяўленне масавай калектывізацыі ў заходніх абласцях Беларусі. Асаблівасці грамадска-палітычнага жыцця ў БССР пасля заканчэння вайны. Аднаўленне працы адукацыйных устаноў. Ажыццяўленне ўсеагульнага сямігадовага навучання. Тэма вайны ў беларускай літаратуры. І. Шамякін, М. Лынькоў, І. Мележ. Творчасць Я. Коласа, Я. Брыля, П. Броўкі, М. Танка, А. Куляшова. Беларускі тэатр. Музычнае і выяўленчае мастацтва. Выхад БССР на міжнародную арэну. Уключэнне БССР ў склад краін — заснавальніц ААН | 5 | Праца з тэставымі заданнямі |
| 53 | Р8.Т2. Сацыяльна-эканамічнае развіццё БССР ў 2-ой палове 50-х – сярэдзіне 80-х гг. ХХ ст.<br>Развіццё машынабудавання і металаапрацоўкі, хімічнай і нафтахімічнай прамысловасці. Фарміраванне прамысловага комплексу БССР. Пераўтварэнне БССР у індустрыяльна развітую краіну. Асноўныя прынцыпы эканамічнай рэформы 1965 г. Экстэнсіўны характар гаспадаркі. Асаблівасці выкарыстання дасягненняў навукова-тэхнічнай рэвалюцыі ў БССР. Урбанізацыя і яе вынікі. Развіццё сельскай гаспадаркі: меліярацыя і хімізацыя, будаўніцтва буйных жывёлагадоўчых комплексаў. Курс на стварэнне аграпрамысловых комплексаў. Змяненне ўмоў жыцця насельніцтва. Замаруджванне тэмпаў росту народнай гаспадаркі ў першай палове 1980-х гг. Наспяванне крызісных з’яў у эканоміцы | 3 | Праца з тэставымі заданнямі |
| 54 | Р8.Т3. Грамадска-палітычнае жыццё БССР у 2-ой палове 50-х – 1-ай палове 80-х гг. ХХ ст.<br>Асуджэнне культу асобы Сталіна. Спробы дэмакратызацыі грамадска-палітычнага жыцця ў гады “адлігі”. Частковая рэабілітацыя. Павышэнне ролі працоўных у жыцці грамадства. Савецкая грамадска-палітычная сістэма ў другой палове 1960-х — першай палове 1980-х гг. Канстытуцыйнае замацаванне кіруючай ролі камуністычнай партыі. Роля Саветаў у грамадска-палітычным жыцці краіны. | 2 | Праца з тэставымі заданнямі |
| 55 | Р8.Т4. БССР у 2-ой палове 80-х гг. ХХ ст.<br>Палітыка “перабудовы” і асаблівасці яе правядзення ў БССР. Увядзенне ў краіне галоснасці. Рэфармаванне савецкай грамадска- | 3 | Праца з тэставымі |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

| | | | |
|---|---|---|---|
| | палітычнай сістэмы. Выбары народных дэпутатаў у Вярхоўны Савет БССР і мясцовыя Саветы на альтэрнатыўнай аснове. Страта КПБ манаполіі на ўладу. Пачатак фарміравання шматпартыйнасці. Паглыбленне крызісных з'яў у эканоміцы. Спробы паскарэння сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны. Перавод прадпрыемстваў на самафінансаванне і гаспадарчы разлік. Уплыў аварыі на Чарнобыльскай АЭС на эканамічнае становішча БССР. Пагаршэнне становішча ў сельскай гаспадарцы. | | заданнямі |
| 56 | Р8.Т5. Развіццё адукацыі і навукі, літаратуры і мастацтва ў БССР у 2-ой палове 50-х – 80-я гг. XX ст.<br>Рэформа школы і пераход да абавязковага 8-гадовага навучання. Увядзенне ўсеагульнай сярэдняй адукацыі. Пашырэнне сістэмы прафесійна-тэхнічнага навучання. Развіццё вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі. Дасягненні ў развіцці навукі. Інтэгравансць беларускай навукі ў агульнасаюзную. Уплыў грамадска-палітычнага жыцця на беларускую літаратуру. Адлюстраванне гістарычных падзей у творчасці У. Караткевіча. Распрацоўка тэмы вайны ў творах І. Шамякіна, В. Быкава, І. Навуменкі, А. Адамовіча. Жыццёвыя лёсы беларусаў у творчасці І. Мележа. Беларуская паэзія. Новыя з'явы ў беларускай літаратуры ў гады перабудовы. Творчыя дасягненні дзеячаў тэатральнага, музычнага і выяўленчага мастацтва Беларусі. | 2 | Праца з тэставымі заданнямі К/р № 8. |
| | **Раздзел 9. Рэспубліка Беларусь у 1991 – пачатку XXI ст.** – 20 г. | | |
| 57 | Р9.Т1. Абвяшчэнне і станаўленне дзяржаўнага суверэнітэту Рэспублікі Беларусь.<br>Рух за нацыянальнае адраджэнне ў Беларусі. Дэкларацыя аб дзяржаўным суверэнітэце БССР 27 ліпеня 1990 г. Усесаюзны рэферэндум па пытанні аб захаванні абноўленага СССР. Закон Вярхоўнага Савета БССР ад 25 жніўня 1991 г. "Аб забеспячэнні палітычнай і эканамічнай самастойнасці БССР". Прыняцце 19 верасня 1991 г. назвы Рэспубліка Беларусь. Белавежскае пагадненне 8 снежня 1991 г. Стварэнне Садружнасці Незалежных Дзяржаў. Прыняцце Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь 15 сакавіка 1994 г. Выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь. Першы Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. Р. Лукашэнка. Рэспубліканскі рэферэндум 1995 г. і яго вынікі. Дзяржаўная сімволіка Рэспублікі Беларусь. | 5 | Праца з тэставымі заданнямі |
| 58 | Р9.Т2. Грамадска-палітычнае жыццё ў Рэспубліцы Беларусь у 2-ой палове 1990-х гг. – пачатку XXI ст.<br>Рэспубліканскі рэферэндум 24 лістапада 1996 г. і яго вынікі. Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь 1994 г. (са змяненнямі і дапаўненнямі). Канстытуцыйны лад Рэспублікі Беларусь. Асновы ідэалогіі беларускай дзяржавы. Умацаванне палітычнай сістэмы ў Рэспубліцы Беларусь. Выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь (2001, 2006). Рэспубліканскі рэферэндум 2004 г. Утварэнне шматпартыйнасці. Дзейнасць грамадскіх арганізацый. Канфесіянальная палітыка дзяржавы. | 5 | Праца з тэставымі заданнямі |
| 59 | Р9.Т3. Сацыяльна-эканамічнае развіццё Рэспублікі Беларусь.<br>Эканамічнае становішча Рэспублікі Беларусь у першай палове 1990-х гг. Асноўныя напрамкі сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь у 1996—2000 гг., 2001—2005 гг. і на 2006—2010 гг.: іх зацвярджэнне на Першым, Другім, Трэцім Усебеларускіх народных сходах і рэалізацыя. Распрацоўка нацыянальнай стратэгіі ўстойлівага развіцця краіны. Галоўныя мэты і асноўныя элементы беларускай мадэлі сацыяльна арыентаванай рынкавай эканомікі, сродкі яе рэалізацыі і дасягненні. Дзяржаўная маладзёжная палітыка. | 5 | Праца з тэставымі заданнямі |
| 60 | Р9.Т4. Міжнароднае становішча і знешняя палітыка Рэспублікі Беларусь.<br>Фарміраванне знешнепалітычнага курсу Рэспублікі Беларусь. Прыхільнасць Беларусі прынцыпам Статута ААН. Умацаванне сувязей з краінамі СНД. Саюз Беларусі і Расіі. Узаемаадносіны з краінамі Еўрапейскага Саюза і НАТА. | 3 | Праца з тэставымі заданнямі |
| 61 | Р9.Т5. Развіццё адукацыі, навукі і культуры ў Рэспубліцы Беларусь.<br>Дасягненні беларускай навукі і яе роля ў фарміраванні інфармацыйнага грамадства. Развіццё сістэмы адукацыі. Літаратура. Адлюстраванне ў мастацтве гістарычнага мінулага беларускага народа. Творчыя дасягненні дзеячаў тэатральнага, музычнага і выяўленчага мастацтва Беларусі. | 2 | Праца з тэставымі заданнямі К/р № 9 (выніковая). |
| | **Усяго:** | **160** | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

РЕПОЗИТОРИЙ БГТУ